2. Общероссийское общественное движение по увековечению памяти погибших при защите Отечества «Поисковое движение России» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rf-poisk.ru/page/230/. – Дата доступа: 09.03.2022.

3. Особенности поисковой работы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/dokopat-do-istiny.html – Дата доступа: 16.03.2022.

4. О Государственной программе «Увековечение памяти о погибших при защите Отечества» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100117. – Дата доступа: 15.03.2022.

5. Обобщенный банк данных «Мемориал» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://xn--b1aqfv.xn--p1ai/poleznaya-informaciya/obobshchennyy-bank-dannykh-memorial/ – Дата доступа: 15.03.2022.

6. Увековечение событий Великой Отечественной войны в Беларуси : монография / Т. П. Савчук ; науч. ред. В. В. Зданович ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2013. – 168 с.

7. Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь, 24 марта 2016 г., № 109. – Режим доступа: https://kodeksy-by.com/norm_akt/source-/type-%D0%A3%D0%BA%D0%B0%D0%B7/109-24.03.2016.htm. – Дата доступа: 15.03.2022.

**Я. В. ЛЕБЯДЗЕЎСКАЯ**
Навуковы кіраўнік – Т. П. Саўчук

## ХАЛАКОСТ У ЛУНІНЕЦКІМ РАЁНЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Годам гістарычнай памяці ў Беларусі быў аб’яўлены 2022 г. Вялікія страты нашай Радзіме прынесла Вялікая Айчынная вайна. За чатыры гады гэтага жудаснага для беларусаў часу загінула 3 млн нашых грамадзян. З іх значная частка – іўдзеі. Яны з’явіліся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў часы Вялікага Княства Літоўскага, а са з’яўленнем мяжы аселасці і перасяленнем яўрэяў у заходнія губерні іх колькасць складала абсалютную большасць амаль ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі.

Самая вялікая трагедыя еўрапейскіх яўрэяў – халакост. Па дадзеных большасці навуковых крыніц, на тэрыторыі Беларусі загінула прыкладна ад 600 да 800 тыс. яўрэяў. На жаль, да сённяшняга дня навуковая распрацоўка тэмы халакоста ў Беларусі знаходзіцца на невысокім узроўні.

Репозиторий БрГУ

Трагедыя халакоста не абмінула і маю малую радзіму – Лунінеччыну. У гады германскай акупацыі на тэрыторыі гарадоў Лунінец, Мікашэвічы і вёсак Кажан-Гарадок, Лахва, Вялікія Чучавічы былі створаны гета. Гета ў г. Лунінцы было створана вясной 1942 г. Аднак яшчэ ў жніўні 1941 г. ва ўрочышчы Мачула гітлераўцы расстралялі 1312 яўрэяў-мужчын узростам ад 18 да 60 гадоў. Таму ў гета знаходзіліся менавіта дзеці, жанчыны і старыя, і калі іх вялі на расстрэл, то супраціўлення з іх боку не было. Акцыя адбылася паміж чыгуначнымі лініямі Лунінец – Пінск і Лунінец – Баранавічы, на адлегласці 1,5 км ад гета – ва ўрочышчы Бараўшчына. Перад пачаткам расстрэлу 100 рамеснікаў былі вернуты назад, але яны будуць расстраляны пазней, у кастрычніку. Акцыя была скончана ў 16 гадзін, расстраляных не менш за 2800 чалавек [5, с. 333]. Яна адбылася 4 верасня 1942 г., але напярэдадні фашысты паспелі знішчыць яўрэяў Кажан-Гарадоцкага і Лахвенскага гета.

У Кажан-Гарадку акцыя адбылася 3 верасня 1942 г. раніцай. Людзей вялі ў некалькі калон, тых, хто выбіваўся з калоны, паліцаі прыкладамі заганялі назад, многія падалі. Каля ямак яўрэі павінны былі распранацца, бо ў іх адзенні было зашыта золата і ўпрыгожанні, пасля вопратка была сабрана і адвезена ў паліцыю.

Збегчы з месца расстрэлу было немагчыма, так як сасоннік быў яшчэ малады, спроба абрывалася стрэламі ў спіну. Было расстраляна 937 чалавек [5, с. 436]. Па ўспамінах сведкаў, яшчэ тры дні зямля варушылася і было чуваць стогны. Карная аперацыя ў Лахве павінна была пачацца ў 9 гадзін раніцы.

Лахва – мястэчка пераважна яўрэйскае. Пасля наступлення немцаў яўрэі рабілі спробы эвакуіравацца на ўсход, але туды прапускалі толькі тых, хто з’яўляўся членам камсамола. Таму ўсходняй граніцай для лунінецкіх яўрэяў на момант вайны сталі Мікашэвічы. Гета ў Лахве з’явілася ў канцы сакавіка або ў пачатку красавіка 1942 г. Але пасля расстрэлаў 1941 г. мужчыны-яўрэі яшчэ засталіся. Гета складалася з 40–50 дамоў, у ім знаходзілася 2 тыс. чалавек. У адным доме пражывала па 50 чалавек, у пакоі тулілася 3–4 сям’і [5, с. 332].

У гета даносіліся чуткі, што ў суседніх Мікашэвічах адзін яўрэйскі юнак збег і за гэта расстралялі ўсё гета, таму пры ўсякім зручным выпадку ў Лахвенскім гета назапашвалі гаручыя вадкасці, бутэлькі, бляшанкі, рэчы, якія можна было выкарыстаць як зброю. Па начах збіраліся і абмяркоўвалі, што можна зрабіць. Дазнаўшыся пра тое, што немцы падрыхтавалі ямы, канчаткова было вырашана здзейсніць паўстанне. Ноччу гета было акружана эсэсаўцамі, прыехаўшымі з Лунінца, і паліцаямі. У 10 гадзін раніцы ў гета ўвайшла група эсэсаўцаў, тады жыхары гета падпалілі дамы, абрынулі град камянёў і бутэлек з гаручым на карнікаў. Далей людзі кідаюцца

Репозиторий БрГУ

да варот, бягуць убок Прыпяці, дзе стаіць лес. З 2000 чалавек выжыла толькі 500–600, ужо з гэтай колькасці 120, некаторыя паўступалі ў партызанскія атрады (яўрэяў туды не так лёгка бралі, але атрымлівалася), некаторых, на жаль, змаглі знайсці немцы і паліцаі, у чым ім дапамаглі мясцовыя жыхары [2, с. 2; 5, с. 332].

Ва ўсіх трох карных аперацыях прымалі ўдзел менавіта паліцэйскія групы. Былі напраўлены атрады СД з Пінска як у Лунінец, так і ў Кажан-Гарадок і Лахву [3; 5, с. 332].

Памяць пра трагічны лес яўрэйскага народа захоўваецца да нашых дзён. У Лунінцы быў устаноўлены абеліск. Устаноўлены помнікі ў Ізраілі ў гарадах Халон і Іерусалім. У Лахве на магіле забітых яўрэяў была ўстаноўлена стэла, рэканструяваная ў 1992 г. Усяго ў Лахве было ўстаноўлена чатыры помнікі вязням гета і тым, хто ўдзельнічаў у паўстанні.

Са з'яўленнем незалежнай Рэспублікі Беларусь візіты яўрэяў на малую радзіму колькасна пабольшыліся. Цяперашнія жыхары Ізраіля, ураджэнцы Лунінца і Лунінецкага раёна, наведваюць помнікі ў горадзе дзяцінства, Кажан-Гарадку, Лахве і іншых вёсках раёна. Яны аддаюць даніну павагі сваім продкам. Адзначым, што рэканструкцыі помнікаў былі здзейснены дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў гэтым менавіта яўрэяў – нашчадкаў з Ізраіля. Асабліва былыя лахвенцы паказваюць нам добры прыклад ушанавання памяці загінулых.

Зараз у прыгарадзе Лунінца пры ўдзеле пракуратуры адбываюцца раскопкі ва ўрочышчах Мачула, Баханова і Бараўшчына, іх праводзяць ваеннаслужачыя 52-га асобнага пашуковага батальёна [4].

У нашай краіне наўрад ці знойдзецца чалавек, які б не ведаў пра трагедыю беларускага і еўрапейскага яўрэйства. Халакост – гэта не толькі боль яўрэйскага народа, гэта боль Беларусі.

Патрэбна працягваць на беларускай зямлі ўвекавечваць памяць ахвяр генацыду і ўсім усвядоміць неабходнасць берагчы гістарычную памяць.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Туміловіч, Васіль. Кажан-Гарадок 500-гадовы [Электронны рэсурс] / Васіль Туміловіч. – Рэжым доступу: http://luninec.by2.by/muza/kgrastrel.html. – Дата доступу: 02.02.2022.

2. Жилко, В. Через все испытания / В. Жилко // Лунінецкія навіны. – 1997. – 25 лістап. – С. 2.

3. Знішчэнне гета ў Кажан-Гарадку [Электронны рэсурс] // Лунінецкі раённы краязнаўчы музей. – Рэжым доступу: http://luninec.by2.by/muza/kgrastrel.html. – Дата доступу: 02.02.2022.

4. В Лунинецком и Ганцевичском районах обнаружены ранее неизвестные места захоронения мирных граждан, убитых немецко-фашист-

Репозиторий БрГУ

скими захватчиками в годы Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] // Советская Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/bez-sroka-davnosti435345.html. – Дата доступа: 02.02.2022.
5. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна / укл. Т. В. Канапацкая. – Мінск : Беларусь, 1995. – 716 с.

**К. В. НАХАЙЧУК**
Навуковы кіраўнік – П. С. Рамановіч

## АДУКАЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД У ЖЫЦЦІ НАПАЛЕОНА ОРДЫ

Берасцейская зямля ганарыцца многімі сынамі, у тым ліку і Напалеонам Ордам (1807–1883). Напалеон Орда – кампазітар, мастак, публіцыст, грамадскі і культурны дзеяч, якога шануюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах Еўропы.

Нарадзіўся Напалеон Орда 11 лютага 1807 г. у дваранскай сям'і, якая жыла ў радавым маёнтку Чырвоны Двор паблізу Варацэвіч Пінскага павета (цяпер Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці). Бацька Напалеона Орды з'яўляўся маршалкам шляхты Кобрынскага павета. Будучы мастак рана (у два гады) страціў бацьку.

Першапачатковую адукацыю Напалеон Орда атрымаў у бацькоўскім доме ў Варацэвічах. Вялікі ўплыў на яго аказала маці Юзэфіна Бутрымовіч – дачка пінскага старасты Мацея Бутрымовіча. Маці была таленавітай піяністкай, таму ён рана стаў музыцыраваць. У дзяцінстве выявілася таксама здольнасць да малявання.

У 12-гадовым узросце сын быў адпраўлены маці ў Свіслацкую гімназію, якая была заснавана ў 1804 г. для навучання моладзі з Брэсцкага, Пружанскага, Кобрынскага, Слонімскага, Ваўкавыскага і Гродзенскага паветаў. У гімназіі меліся шэсць асноўных класаў, у якіх займаліся каля 300 вучняў [1, с. 235]. Выкладаліся польская, грэчаская, нямецкая, французская мовы, латынь, арыфметыка, алгебра, фізіка, геаметрыя, трыганаметрыя, прыродазнаўства, архітэктура, хімія, права, палітэканомія, каліграфія, гісторыя, міфалогія, касмаграфія, садоўніцтва, батаніка, сельская гаспадарка, мінералогія, мараль, логіка, рыторыка, эстэтыка, маляванне, музыка, гімнастыка [2, с. 22–23]. Сучаснікі лічылі Свіслацкую гімназію адной з найлепшых устаноў Літвы.

З 1819 г. у гімназіі пачалі стварацца гурткі, удзельнікі якіх увайшлі ў тайную арганізацыю "Таварыства аматараў навук", заснаваную ў 1820 г. Напалеон Орда ўступіў у тайнае таварыства "Заране", створанае ў Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях. "Заране" марылі пра незалежнасць зямель Рэчы Паспалітай, адкрыта выказвалі пратэст супраць нацыянальнай

Рэпазіторый БрДУ